Гавяйновіч, В. Салдацкае брацтва / В. Гавяйновіч // Полацкі веснік. — 2010. — 12 лют. — С. 1.

САЛДАЦКАЕ БРАЦТВА



Аляксандр Хамчаноўскі ведае, што такое салдацкае брацтва. І да канца зразумее яго гэткі ж салдат, які ў баях губляў баявых сяброў.

Мы слухаем успаміны Аляксандра Уладзіміравіча і пераносімся на хвалях яго памяці ў 1986 год, на граніцу з Афганістанам, у Пянджскі пагранічны атрад, куды ён трапіў пасля вучэбна-палявога цэнтра «Халкаяр». Ён служыў у элітных пагранічных войсках, і ахоўваць граніцу СССР іх трэцяй мотаманеўранай групе даводзілася з боку Афганістана, што па ваенным часе было апраўдана: аднойчы душманы абсталялі мірны горад Пяндж.

За 23 месяцы вайны (салдаты не вымяраюць час гадамі) Аляксандр Хамчаноўскі быў вадзіцелем пражэктара, другім нумарам гранатамёта і кулямёта, гранатамётчыкам. А нумар аўтамата, з якім прайшоў гэтыя амаль два гады, і зараз без запінкі паўторыць у любы час сутак.

Душманы выраставалі нібыта з-пад зямлі, і бой мог завязацца ў любы момант. Неяк яны ахоўвалі часовы аб´ект – бавоўнавы перапрацоўчы завод. Умовы палявыя, у лазню ездзілі за 12 кіламетраў на заставу ў г. Нанабад. Аднойчы па дарозе іх абстралялі, і пяць адзінак тэхнікі душманы адрэзалі ад сваіх. Камандзір накіраваў трох салдат, сярод іх быў і Аляксандр, замініраваць падыходы да брані (БТЭРаў і БМП). Выдзвінуліся на метраў 200, сталі аглядаць мясцовасць. Аляксандр убачыў, як двое душманаў каля дувала (гліняны плот) зараджаюць гранатамёт. Ён прыцэліўся, і ў гэты момант па ім раздалася аўтаматная чарга. Паспеў стрэліць, і фантан пяску заслаў вочы – ён упаў у арык…

Аляксандр Хамчаноўскі верыць у лёс: крышачку вышэй праляцелі б кулі – і ўсё.

Асабліва помніцца адна іх бліскучая аперацыя, калі пагранічнікі разбілі атрад душманаў, і ніхто з савецкіх салдат не быў паранены. За гэтую аперацыю Аляксандр Хамчаноўскі ўзнагароджаны медалём «За отличие в охране государственной границы». Але былі моманты, калі даводзілася праводзіць на Радзіму сваіх загінуўшых баявых сяброў…

Бацькі так і не ведалі, што ён 23 месяцы служыў у Афганістане. А дамоў у сваю родную вёсачку Фядоценкі Зялёнкаўскага сельсавета вярнуўся 29 снежня 1987 года. Вярнуўся з вайны чалавекам, які не церпіць фальшу, і жыццё сваё стараецца ладзіць так, каб жылося светла.

Зараз Аляксандр Хамчаноўскі жыве ў вёсцы Зялёнка і працуе ляснiком у Зялёнкаўскім лясніцтве. Чалавек ён майстравы. Гэты талент у яго ад бацькі Уладзіміра Мікалаевіча, які быў і механізатарм, і кавалём. А мама Кацярына Анісімаўна такі пякла хлеб, што яго смак успамінаецца і да гэтага часу.

З асабістага архіва.

Аляксандр Уладзіміравіч вельмі даражыць сваёй сям´ёй – гэта для яго самае важнае ў жыцці. Жонка Людміла Георгіеўна ў яго надзейная, любімая, усё разумеючая. Пяцікласнік сын Вадзім – бацькоўскі памочнік і выдатнік у школе.

На развітанне Аляксандр Уладзіміравіч удакладняе, ці ведаем мы яшчэ адно значэнне слова «служба»? У пакоі ўсталёўваецца цішыня, і ён кажа: *«Самым лепшым урокам жыцця была армія»*…

В. Гавяйновіч